ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

## *ВУЧОНЫЯ БЕЛАРУСІ*

***BELARUSIAN SCIENTISTS***

Паступіў у рэдакцыю 13.05.2019
Received 13.05.2019

# СЦЯПАН СЦЯПАНАВІЧ ЛАЎШУК
**(Да 75-годдзя з дня нараджэння)**



Юбілейныя даты на лістках жыццёвага календара, як правіла, абазначаны асаблівым урачыста-святочным і засяроджана-роздумным настроем. Гэта час падвядзення вынікаў, асэнсавання зробленага і акрэслівання новых задач, перспектыў у няспынным жыццёва-творчым пошуку.

Аднак сакраментальнае "падвядзенне вынікаў" пасуе не ўсім юбілярам. Не спыняючыся на дасягнутым і ўпэўнена пазіраючы ў будучыню, у выдатнай працоўнай форме, поўны смелых планаў і наватарскіх задум сустракае свой юбілей вядомы літаратура- і тэатразнаўца, доктар філалагічных навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі Сцяпан Сцяпанавіч Лаўшук. У кантэксце шырокага дыяпазона яго прафесійных інтарэсаў, навуковых зацікаўленняў і жыццёвых прыярытэтаў вядучае месца займае магістральны кірунак, які паслядоўна, мэтанакіравана ім развіваецца. Вучоны праявіў выключнае пастаянства, засяроджанасць, дасведчанасць у глыбокім, карпатлівым і самаадданым даследаванні беларускай драматургіі і гісторыі беларускага тэатра. І можна смела сцвярджаць, што на ніве айчыннага літаратуразнаўства ў гэтых праблемна-тэматычных абсягах яму цяжка знайсці роўных.

А пачалося захапленне на ўсё жыццё з самога дзяцінства, з заварожанага праслухоўвання вясковым хлопчыкам пастановак радыётэатра, што рэгулярна трансліраваліся па беларускім радыё. Нарадзіўся Сцяпан Сцяпанавіч у мястэчку Васілевічы Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці 28 ліпеня 1944 года ў сям'і чыгуначніка. У 1961 годзе скончыў Васілевіцкую сярэднюю школу № 2. У 1962–1967 гадах вучыўся на філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У студэнцкія гады праявіў здольнасці да навуковай працы пры напісанні курсавых і дыпломнай работ, удзельнічаў у асваенні цалінных зямель, займаўся спортам, атрымаў разрад кандыдата ў майстры спорту па вольнай барацьбе. Пасля заканчэння ўніверсітэта настаўнічаў у Лунінецкім раёне, займаў пасаду дырэктара Бродніцкай НСШ. У 1970 годзе паступіў ў аспірантуру пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН Беларусі, пасля заканчэння якой паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю "Сучасная беларуская драматургія: праблемы канфлікту і характару" (1974). У 1998 годзе была паспяховая абарона доктарскай дысертацыі "Беларуская драматургія XX стагоддзя: асноўныя праблемы развіцця".

Жыццё і дзейнасць юбіляра ўжо амаль паўстагоддзя звязаны з Нацыянальнай акадэміяй навук, Інстытутам літаратуры імя Янкі Купалы, дзе быў пройдзены шлях ад малодшага навуковага супрацоўніка да загадчыка аддзела, намесніка дырэктара па навуковай рабоце. У 1998 годзе вучонаму прысвоена ганаровае званне прафесара, у 2004 годзе ён абраны членам-карэспандэнтам НАН Беларусі. Зараз Сцяпан Сцяпанавіч працуе на пасадзе галоўнага навуковага супрацоўніка Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. Падчас шматгадовай працы ярка і плённа праявіўся яго талент ўдумлівага, сур'ёзнага даследчыка і мудрага арганізатара навукі. І сёння вучонага адрознівае актыўная і сапраўды падзвіжніцкая дзейнасць, скіраваная на ўвасабленне ў жыццё інавацыйных ідэй і праектаў грунтоўнага вывучэння і папулярызацыі нацыянальнай духоўна-культурнай, літаратурна-мастацкай спадчыны. Сцяпан Сцяпанавіч дапамагае вызначыць стратэгію і тактыку распрацовак аддзела беларускай літаратуры XX–XXI стст., Інстытута літаратуразнаўства, робячы стаўку на калектыўнае вырашэнне фундаментальных навуковых праблем. Вялікую ўвагу надае падрыхтоўцы навуковых кадраў, пад яго кіраўніцтвам абаронена каля 15 кандыдацкіх дысертацый.

Заслугі вучонага пераканаўча дэманструюць факты і лічбы: ім напісана звыш 300 навуковых артыкулаў, выдадзена два дзясяткі навуковых манаграфій (у тым ліку ў сааўтарстве). Сярод іх: “Сучасная беларуская драматургія” (1977), “З думкай пра сучасніка” (1977), “Першы народны артыст БССР” (1982), “Станаўленне беларускай савецкай драматургіі” (1984), “Высокія арбіты грамадзянскасці” (1984), “Кандрат Крапіва і беларуская драматургія” (1986, 2002), “На драматургічных скрыжаваннях” (1989), “Гарызонты беларускай драматургіі” (2010), “Праз церніі да брамы неўміручасці. Кандрат Крапіва і беларуская драматургія” (2016). Сааўтар навуковых зборнікаў “Беларуская літаратура і праблемы сучаснасці” (1978), “У. І. Ленін і Кастрычніцкая рэвалюцыя ў беларускай літаратуры” (1987), “На парозе 90-х: літаратурны агляд” (1993), увайшоў у калектыў аўтараў “Истории белорусской советской литературы” (1977), “Гісторыі беларускай савецкай літаратуры: у 2 т.” (1981–1982); “Нарысаў па гісторыі беларуска-рускіх літаратурных сувязей; у 4 кн.” (1993–1995), “Гісторыі беларускай літаратуры” (1999). Сцяпан Сцяпанавіч выступіў рэдактарам і адным з аўтараў “Гісторыі беларускай літаратуры ХХ стагоддзя: у 4 т., 6 кн.” (1999–2014), унікальнага выдання, што заняло годнае месца ў парадыгме сучаснай літаратуразнаўчай навукі Беларусі. Новая гісторыя беларускай літаратуры грунтуецца на фундаментальных тэарэтычных ведах і прафесійным літаратуразнаўчым аналізе. Упершыню прадстаўлены маштабны і цэласны малюнак развіцця айчыннага прыгожага пісьменства ХХ стагоддзя, што адпавядае запатрабаванням новага часу.

Манаграфію “Гарызонты беларускай драматургіі” (2010) характарызуе шматаспектнасць праблематыкі, аналітычная і інфармацыйная змястоўнасць падачы матэрыялаў, што раскрываюць складаныя працэсы станаўлення, развіцця беларускай драматургіі ад глыбокай даўніны да нашых дзён, лагічна і паслядоўна змешчаныя даследчыкам у шырокі гісторыка-культурны кантэкст і цесна звязаныя з увасабленнем ментальных кодаў нацыянальнай ідэі. Панарамна выпісаныя ў кнізе сузор’і імёнаў, фактаў, твораў сведчаць пра надзвычай ашчаднае стаўленне вучонага да беларускай драматургічнай спадчыны, у якой ніводная з’ява не засталася па-за ўвагай пільнага і дапытлівага даследчыцкага позірку. Пад яго пяром такія шэдэўры беларускага тэатральнага мастацтва, як “Паўлінка”, “Раскіданае гняздо” Я. Купалы, “Хто смяецца апошнім”, “Брама неўміручасці” К. Крапівы, “Лявоніха на арбіце”, “Трыбунал” А. Макаёнка, “Мудрамер” М. Матукоўскага, “Вечар”, “Радавыя” А. Дударава і многія іншыя п’есы атрымалі грунтоўную навукова-тэарэтычную і ідэйна-эстэтычную трактоўку. Сцяпан Сцяпанавіч знаходзіўся і знаходзіцца ў трывалых сяброўскіх стасунках з вядомымі драматургамі, рэжысёрамі і артыстамі: Кандратам Крапівой і Андрэем Макаёнкам, Барысам Луцэнкам і Валерыем Раеўскім, Марыяй Захарэвіч і Генадзем Аўсяннікавым. Пералік імёнаў можна працягваць.

Манаграфія “Праз церніі да брамы неўміручасці. Кандрат Крапіва і беларуская драматургія” (2016), адметная змястоўнай і захапляльнай формай падачы навуковага матэрыялу пра класіка беларускай драматургіі, атрымала высокую адзнаку – прэмію Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі 2017 года ў галіне літаратуры, мастацтва, журналістыкі і аматарскай творчасці. Унікальнасць асобы Кандрата Крапівы таленавіта і пераканаўча раскрываецца праз прызму паняццяў элітарнасці і выключнай працаздольнасці, асветленых шчодрымі промнямі даследчыцкай любові.

Прыроджаная здольнасць Сцяпана Сцяпанавіча Лаўшука аб’яднаць калектыў аднадумцаў высакароднай ідэяй рэалізавалася ў тым, каб у фармаце ўспамінаў аддаць даніну памяці і павагі знакавым асобам у беларускай літаратуразнаўчай навуцы. Намаганнямі і клопатамі вучонага выдадзены кнігі “Жыццё не песціла мяне…”: успаміны пра Васіля Уладзіміравіча Івашына” (2013), “Дарыў святло душы сваёй людзям і Айчыне: успаміны пра Юльяна Сяргеевіча Пшыркова” (1015), “Летуценнасць і вялікія здзяйсненні: успаміны пра Івана Якаўлевіча Навуменку” (2017).

Немагчыма пераацаніць руплівую дзейнасць юбіляра па выданні і папулярызацыі беларускай драматургічнай спадчыны. Сярод выданняў “Творы: драматургія, паэзія, проза, публіцыстыка” Уладзіслава Галубка (1983), “Збор твораў: у 5 тамах” Андрэя Макаёнка (1987–1990), “Збор твораў: у 6 тамах” Кандрата Крапівы (1997–2004), зборнікі “Беларуская дакастрычніцкая драматургія” (1978), “П’есы” (1984), “Вершы, байкі, эпіграмы і паэмы” (1991), “Хлопчык у лесе” (1992), “Залатыя каласкі” (1994), “Казкі для сцэны” (1995), “Цудоўная дудка” (1997) і інш. Пад кіраўніцтвам вучонага у 2000–2017 гадах быў ажыццёўлены маштабны праект выдання Збору твораў народнага пісьменніка Беларусі Івана Навуменкі ў 10 тамах. У выніку зладжанай працы калектыву навукоўцаў атрымаўся трэнд змястоўны і дабротны. Кожны том суправаджаюць навукова-тэматычныя пасляслоўі і разгорнутыя, выверaныя каментарыі, што надае сама-каштоўнаму выданню спадчыны Івана Навуменкі дадатковую моцную канцэптуальнасць.

Сцяпан Сцяпанавіч Лаўшук з’яўляецца членам Саюза беларускіх пісьменнікаў, Беларускага саюза літаратурна-мастацкіх крытыкаў, Старшынёй беларускага аддзялення Міжнароднай славянскай акадэміі навук, адукацыі, мастацтва і культуры і многіх іншых грамадскіх арганізацый.

Шматгадовая, самаадданая і плённая дзейнасць вучонага адзначана высокімі дзяржаўнымі ўзнагародамі: ордэнам Францыска Скарыны (2004), знакам “Выдатнік друку Беларусі”, многімі памятнымі медалямі.

Ганаровыя званні, высокія заслугі і іншыя атрыбуты паспяховасці складаюць неад'емную частку прафесійнага іміджу юбіляра, аднак важнейшае і прынцыповае крэда яго жыццёвай і творчай пазіцыі – увага і клопат пра Чалавека, галоўнага героя любой, у тым ліку самай што ні на ёсць жыццёвай п'есы. Сцяпана Сцяпанавіча любяць, цэняць і паважаюць у калектыве. Чалавек энцыклапедычных ведаў і зайздроснай навукова-культурнай эрудыцыі, ён ахвотна дэманструе іх на практыцы, заўсёды адкрыты да размовы і шчырай слушнай парады.

Калегі, вучні, паслядоўнікі Сцяпана Сцяпанавіча жадаюць яму моцнага здароўя, жыццёвага і творчага даўгалецця, новых яркіх ідэй і іх паспяховага здзяйснення.

*Ж. С. Шаладонава*

## Информация об авторе

**Шаладонова Жанна Сергеевна** – кандидат филологических наук, старший научный сотрудник. Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы, Национальная академия наук Беларуси (ул. Сурганова, 1, корп. 2, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: shaladonov@tut.by.

## Information about the author

**Zhanna S. Shaladonava** – Ph. D. (Philol.), Senior Scientific Researcher. Center for the Belarusian Culture, Language and Literature researches of the National Academy of Sciences of Belarus (1 Surganov Str., Bldg 2, Minsk 220072, Belarus). E-mail: shaladonov@tut.by.